ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 МАЯ 2018 г. СУБОТА № 99 (28715)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЮБІЛЕЙ НА ГРАНІЦЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне камандаванню, асабоваму складу, ветэранам органаў пагранічнай службы да 100-годдзя пагранічнай службы нашай краіны, паведамілі ў прэсс-службе кіраўніка дзяржавы.

У віншаванні адзначаецца: «Гісторыя вартавых граніц — гэта яркая і гераічная старонка летапісу нашай Радзімы. Мы па праве ганарымся подзвігамі пагранічнікаў, схіляем галовы перад памяццю тых, хто аддаў сваё жыццё за Бацькаўшчыну». Прэзідэнт звярнуў увагу, што цяперашняе пакаленне воінаў у зялёных фуражках беражліва захоўвае і прымнажае баявыя традыцыі сваіх папярэднікаў. «Праяўляючы пільнасць і прафесіяналізм, вы гарантуеце надзейную перашкоду сучасным выклікам і пагрозам пагранічнай бяспецы, прымаеце ўсе неабходныя меры для абароны рубяжоў нашай дзяржавы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што асабовы склад органаў пагранічнай службы і ў далейшым будзе канкрэтнымі справамі апраўдваць высокі давер беларускага народа, прыкладзе ўсе сілы, вопыт і майстэрства для забеспячэння стабільнасці і парадку на дзяржаўнай граніцы. Асаблівыя словы падзякі і найлепшыя пажаданні Аляксандр Лукашэнка выказаў ветэранам-пагранічнікам.

Дарэчы, за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў, высокі прафесіяналізм, значныя заслугі ў ахове дзяржаўнай граніцы вайскоўцы органаў пагранічнай службы ўдастоены дзяржузнагарод. Прэзідэнт падпісаў адпаведны ўказ.

Ордэнам «За службу Радзіме» III ступені ўзнагароджаны намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігар Печань і начальнік 16-й пагранічнай групы пагранічнай службы Канстанцін Моластаў. Акрамя таго, 13 вайскоўцаў з розных падраздзяленняў удастоены медалёў «За адзнаку ў воінскай службе» і «За адзнаку ў ахове дзяржаўнай граніцы».

Надзея АНІСОВІЧ.

Знак пагранічнікаў з'явіўся ў сталіцы

У гэтыя дні ў краіне святкуецца 100-годдзе пагранічнай службы Беларусі. Напярэдадні юбілею ў Мінску на бульвары Талбухіна быў урачыста адкрыты памятны знак «Вартавым граніцы ўсіх пакаленняў».

З ініцыятывай стварэння такога знака выступіла кіраўніцтва Дзяржпагранкамітэта. Кампазіцыю з граніту і мармуру ўвасобіў скульптар Генадзь Буралкін. Ён вядомы як стваральнік мемарыяльнага комплексу «Воінам-пагранічнікам» у Гродне. Разам з ім над знакам працаваў член Саюза архітэктараў Віктар Карака.

У цэнтры кампазіцыі знаходзіцца стылізаваны пагранічны знак, зроблены са светлага граніту. На яго гранях — гербы Беларусі і СССР. Гэта своеасаблівы сімвал сувязі многіх пакаленняў ахоўнікаў межаў. На цэнтральным фасадзе нанесена эмблема органаў пагранічнай службы. А вакол знака размешчаны надпіс «Вартавым граніц усіх пакаленняў у гонар 100-годдзя пагранічнай службы».

— Пагранічныя войскі з моманту стварэння сталі адным з гарантаў свабоды і незалежнасці нашай дзяржавы, — зазначыў **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль ЛАПО.** — Воіны-пагранічнікі надзейна ахоўваюць рубяжы нашай Айчыны. У любых умовах яны добрасумленна выконвалі свой воінскі абавязак. У Беларусі нямала манументаў і помнікаў, якія ўвекавечваюць памяць пра абаронцаў нашай Радзімы. Сёння, адкрываючы памятны знак, мы згадваем подзвігі абаронцаў рубяжоў нашай Радзімы і аддаём даніну памяці тым, хто забяспечыў нашаму народу мірнае неба.

Мяркуецца, што памятны знак стане месцам для збору пагранічнікаў у святочныя дні.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

У пацвярджэнне стратэгічнага партнёрства

Намеснік старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Цішань наведае Беларусь з афіцыйным візітам 27—29 мая. Візіт адбудзецца па запрашэнні прэм'ер-міністра Беларусі Андрэя Кабякова, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу ўрада.

Запланаваны афіцыйныя перагаворы Андрэя Кабякова і Ван Цішаня ў пашыраным складзе. Праграмай знаходжання таксама прадугледжана наведванне Ван Цішанем Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. «Адметна, што гэты візіт у Беларусь — першы замежны афіцыйны візіт Ван Цішаня на гэтай пасадзе», — адзначылі ў прэс-службе ўрада.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ТРАЕЦКІ ПАРТРЭТ НА ФОНЕ ІСЛАЧЫ

Фота Анатоля КІСЕЛЮКА.

Вёска Ракаў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СЯМАШКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«У Беларусі створаны ўсе неабходныя ўмовы, каб інавацыі і інвестыцыі развіваліся, каб яны акупляліся ў кароткія тэрміны. У краіне пастаянна ўдасканальваецца заканадаўчая база, вызначаны шэраг прэферэнцый і льгот, працуюць свабодныя эканамічныя зоны, Парк высокіх тэхналогій. Акрамя таго, Беларусь з'яўляецца выдатнай пляцоўкай для выхаду замежных кампаній-інвестараў на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза з колькасцю насельніцтва больш чым 182 млн чалавек».

■ Актуальна

АДНА СЕКУНДА ДА БЯДЫ

Колькасць траўмаў, няшчасных выпадкаў з дзецьмі летам істотна ўзрастае

Няшчасце можа напаткаць у любы час, але асабліва шмат усяго непрыемнага здараецца, калі дзеці выходзяць на вуліцу, выязджаюць на адпачынак да вадаёмаў, у вёску да бабуль-дзядуль альбо проста падыходзяць да вокнаў, якія адчынены для праветрывання. І вось ужо сёлета ў траўматолага-артапедычным аддзяленні Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы лячыўся пацыент, які выпаў з акна трэцяга паверха. На шчасце, траўмы былі не вельмі цяжкія, найбольш пацярпела скіўіца. Хлопчык ужо пераведзены ў аддзяленне сківічна-тваравай хірургіі. Прагнозы, як кажуць медыкі, добрыя.

ВОКНЫ ТОЯЦЬ НЕБЯСПЕКУ

Загадчык траўматолага-артапедычнага аддзялення названай бальніцы Андрэй БРАЗОЎСКІ зноў нагадвае бацькам пра іх абавязак пільна сачыць за малымі ў пакоі, дзе лёгка адчыняюцца вокны: «Кожны спадзяецца, што з яго дзіцем гэтага не здарыцца. Але ж дзеці, асабліва ў тры-чатыры гады, не ўсведамляюць небяспеку. Яны становяцца на падаконнік, смела глядзяць уніз. Адна секунда — і маленькі чалавек ужо там. І тады — альбо яго больш няма, альбо — цяжкае працяглае лячэнне, рэабілітацыя і ўсе наступствы».

Андрэй Мікалаевіч згадвае леташнія выпадкі. З аднаго брэсцкага мікрараёна, амаль з аднаго квартала, да іх прывезлі двое пацыентаў, што выпалі з вокнаў. Маленькае дзіця, пасля падзення з восьмага паверха, на жаль, выратаваць не змаглі. Другі хлопчык, што выпаў з балкона, пасля лячэння пайшоў з бальніцы сваімі нагамі.

СТАР. 2

■ Справы аграрныя

БАБОВАЯ ЭКАНОМІКА

Што атрымае сельская гаспадарка ад вырошчвання соі?

Гэту тэму падказаў наш чытач: у сваім лісце ён абураўся, чаму на Беларусі не вырошчваецца соя. Між іншым, «вялікі боб» (менавіта так называлі гэтую культуру ў Кітаі) з'явіўся на нашых землях больш чым сто гадоў таму, яго можна было сустрэць у агародах некаторых сялян. А ў канцы XIX стагоддзя аграном Асінскі клапаціўся пра вырошчванне соі ў Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях. На жаль, сёння пад такую сельскагаспадарчую культуру ў нашай краіне занята толькі крыху больш за дзве тысячы гектараў, і гэта пры тым, што ў Беларусі створана 12 сартоў соі! У той жа час у Расіі беларускія сарты прадстаўлены на плошчы ў 150 тысяч га! І яны вырошчваюцца ў самых розных абласцях — ад Калінінграда да Уладзівастока, вытрымліваюць канкурэнцыю з канадскімі, французскімі, балканскімі сартамі і нават па сваіх якасцях перасягаюць замежнае насенне. Бо канадскія сарты не змогуць расці, напрыклад, у Разані ці Уладзіміры, а беларускія адаптаваныя да такіх умоў. Запатрабаваная беларуская соя і ў Еўропе (напрыклад, яна вырошчваецца ў Вялікабрытаніі). Што ж перашкаджае нам вырошчваць яе ў большых аб'ёмах?

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП АДМЯНІЎ СУСТРЭЧУ З КІМ ЧЭН ЫНАМ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвясціў аб адмове ад сустрэчы з лідарам КНДР Кім Чэн Ынам, правядзенне якой было папярэдне запланавана на 12 чэрвеня ў Сінгапуры. Пра гэта гаворыцца ў лісце кіраўніка Белага дома, распаўсюджаным амерыканскай адміністрацыяй у Twitter. У той жа час Трамп адзначыў, што ў будучыні будзе гатовы сустрэцца з паўночнакарэйскім лідарам. Адмову ад правядзення саміту прэзідэнт Злучаных Штатаў патлумачыў адкрытай варожасцю, якую праявіў асабіста Кім Чэн Ын у яго нядаўніх заявах у адрас Вашынгтона. «Гэтая ўпушчаная магчымасць — насамрэч сумны момант у гісторыі», — адзначыў прэзідэнт ЗША. У сваю чаргу намеснік кіраўніка паўночнакарэйскага МЗС Кім Ке Гван заявіў, што ў КНДР па-ранейшаму імкнуцца наладзіць адносіны з ЗША і гатовы правесці сустрэчу з амерыканскімі ўладамі ў любы час і ў любым фармаце, перадае агенцтва «Рэнхап».

НАФТА ТАННЕЕ НА НАВІНАХ АД АПЕК+

Сусветныя цэны на нафту паказваюць адмоўную дынаміку. Інвестары, перш за ўсё, рэагуюць на заявы міністраў энергетыкі Саудаўскай Аравіі і Расіі аб магчымым змякчэнні ўмоваў пагаднення аб абмежаванні здабычы гатай сыравіны (АПЕК+). Кошт ліпеньскіх ф'ючарсаў на паўночнаморскую нафтавую сумесь маркі Brent упаў на 0,19 %, дасягнуўшы паказчыка 78,64 за бараль, ліпеньскія ф'ючарсы на нафту маркі WTI страцілі 0,17 % і сталі каштаваць $70,59. Раней міністр энергетыкі Саудаўскай Аравіі Халід аль-Фаліх паведаміў, што канчатковае рашэнне аб змякчэнні ўмоў здзелкі па скарачэнні здабычы нафты яшчэ не прынятае. Такую ж пазіцыю выказаў і міністр энергетыкі РФ Аляксандр Новак, які пацвердзіў, што краіны АПЕК+ абмяркуюць змякчэнне ўмоў у чэрвені.

ГАМБУРГ СТАНЕ ПЕРШЫМ ГОРАДАМ, ЯКІ ЗАБАРАНІЎ ДЫЗЕЛІ

31 мая ўступае ў сілу забарона на язду на машынах з дызельнымі рухавікамі па двух вуліцах у цэнтры Гамбурга. Новаўвядзенне распаўсюджваецца не на ўсе дызельныя машыны другога па колькасці насельніцтва горада ФРГ. Пад забарону трапляюць 214 тысяч «дызеляў» стандарту Euro-5 або яшчэ больш старыя аўто — прыкладна дзве трэці ўсяго дызельнага аўтапарка Гамбурга. У Берліне спадзяюцца, што прыклад Гамбурга, накіраваны на барацьбу з забруджваннем паветра, пяроймуць і іншыя нямецкія гарады. На старых «дызелях» з наступнага чацвярга нельга будзе праехаць па Stresemannstrasse, вуліцы працягласцю 1,6 км, і па 600-метровым адрэзку Max-Brauer-Allee. Забарона не дзейнічае на грамадскія аўтобусы і жыхароў названых вуліц. Гарадскія ўлады ўжо ўсталявалі забаронныя знакі і паказалі шляхі аб'езду закрытых магістраляў.

ISSN 1990 - 763X

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«Журналістыка сённяшняга дня — гэта інфармацыя, інфармацыя і інфармацыя»

Міхаіл ІСАЕЎ, пенсіянер, былы рэдактар раённага радыё ў Горках:

— Я гляджу на «Звязду» не толькі як чытач, але і як журналіст з амаль 40-гадовым стажам. Справаздачы з афіцыйных мерапрыемстваў, у якіх удзельнічаюць кіраўнікі нашай дзяржавы, газета дае не так ужо сціслы, крыху можна пачытаць. Цікавая таксама рубрыка «Што ў свеце робіцца» і аналітыка Захара Бурака на старонцы «Кантыненты». Здагадваюся, што гэта псеўданім.

Мне падабалася, калі на першай старонцы газета давала навіны адным радком, якія датычыліся жыцця ўнутры краіны. Час цяпер імклівы, і ўсё, што падаецца кораткa, увагу прыцягвае і чытаецца хутчэй. Шкада, што знікла інфармацыя пра курс валют. Журналістыка сённяшняга дня — гэта інфармацыя, інфармацыя і інфармацыя.

Фотакарэспандэнты ў «Звяздзе» — майстры ад Бога. Галоўны здымак на першай старонцы, аўтар якога, як правіла, Анатоль Кляшчук, — не проста фота, гэта карціна. Фота на першай — вельмі моцны бок газеты.

Чытаю ўсе тэматычныя дадаткі. Нешта знаходжу ў «Чырвонцы». Цікава выглядае калонка Надзеі Дрылы-Дрындрожык у «Сямейнай газеце». Спадабалася, як была пададзена «малочная» тэма ў «Союзе-Евразия». Адначасова адсочваў яе ў інтэрнэце. Мне шкада, што ранейшы фармат, калі восем палос «Союза-Евразия» былі цалкам запоўненыя журналісцкімі тэкстамі, не захоўваецца. Цяпер, на жаль, частку гэтага аб'ёму займае рэклама. Я разумею, што рэклама — гэта грошы, але ж хапае іншых старонак.

«Мясцовае самакіраванне» раней выходзіла ў сераду, я прывык да гэтага, і цяпер мне здаецца не вельмі зручным, што дадатак выходзіць у пятніцу, ды яшчэ з тэлепраграмай, у выніку атрымліваецца вялікі аб'ём. Магчыма, справа ў звычцы. Тэмы, якія ўздымаюцца ў «Мясцовым самакіраванні», актуальныя, але не хапае адказаў на пастаўленыя пытанні. Як акрэсленыя праблемы вырашаць? Мяне, напрыклад, хвалюе развіццё аграпрамысловага комплексу ў Дрыбінскім раёне, дзе жыву, у Горках, дзе працаваў. Я б хацеў больш атрымліваць інфармацыі пра гэта, знаходзіць аналіз няўдач, бачыць выхад са складаных абставін. Мне крыўдна, напрыклад, што сяльчане, у прыватнасці даяркі на ферме, атрымліваць заробкі, вельмі далёкія ад сярэдніх па краіне...

У пятніцу, дарэчы, выходзіць цікавая рубрыка Валянціны Доўнар «Алё, народ на провадзе!», аўтарская калонка Алены Ляўковіч «Неасабісты суб'ектыў». Гэта прачытваецца заўсёды.

Я жыву са «Звяздой» усё сваё жыццё, прычым не толькі дарослае. Мая маці працавала паштальёнам, а нарадзіўся я ў аддаленай вёсцы Кішчыцы спачатку Дрыбінскага, потым Шклоўскага раёна. Пошту прывозілі ў другой палове дня, зімой цямнела рана, таму ў суседнія вёскі маці развозіла газеты наступнай раніцай. Такім чынам, газеты «начавалі» ў яе сумцы ў нас дома. Я любіў чытаць іх усе. А «Звязда» настолькі запала ў душу, што я стаў сам «выдаваць» яе на лістках са сшытка, куды запісваў усё, што бачыў вакол. Трэба аддаць «Звяздзе» належнае — яна пры ўсіх рэдактарах захавала лагатып, той самы, які я ў дзяцінстве так старанна капіраваў на свае аркушы са школьнага сшытка.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.